УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73
К666

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук БДПУ
(пратакол № 7 ад 29.03.05)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры новай і навейшай гісторыі БДПУ *П. А. Тупік*

**Корзюк, А. А.**
К666 Шляхі фарміравання пазнавальнага інтарэсу вучняў у працэсе вывучэння гісторыі Беларусі ў школе (канец XVIII – пачатак XX ст.) : метад. дапам. / А. А. Корзюк; пад навук. рэд. І. І. Багдановіча. — Мн. : БДПУ, 2005. — 47 с.

У дапаможніку прапанаваны разнастайныя варыянты ўрокаў, змешчаны праблемныя заданні. Даюцца фрагменты з твораў мастацкай літаратуры. Выкарыстаны вопыт вывучэння ваенна-гістарычнага і культурна-гістарычнага матэрыялаў.
Адрасуецца студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ.

УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3(4Бел)я73

© Корзюк, А. А., 2005
© ВВЦ БДПУ, 2005

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**А. А. Корзюк**

# ШЛЯХІ ФАРМІРАВАННЯ ПАЗНАВАЛЬНАГА ІНТАРЭСУ ВУЧНЯЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ШКОЛЕ (КАНЕЦ XVIII – ПАЧАТАК XX ст.)

*Метадычны дапаможнік*

8991
Бібліятэка
БДПУ імя М. Танка

Мінск 2005

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

14.Калі і дзе была адчынена новая ВНУ ў Беларусі? З'яўленне якіх літаратурных твораў звязана з ёй?

15.Назавіце імёны кампазітараў 1 паловы 19 ст. і іх самыя вядомыя творы.

16.Хто быў самым славутым мастаком Беларусі гэтага часу?

17. (выніковы) Якія вывады можна зрабіць, прааналізаваўшы развіццё культуры Беларусі канца 18 – першай паловы 19 ст.?

Другі варыянт прадугледжвае арганізацыю камбінаванага ўрока.

Праверка хатняга задання арганізуецца шляхам спалучэння франтальнай і індывідуальнай работы з вучнямі па папярэдняй тэме:

а) арганізацыя франтальнай работы з класам:

1. Назавіце першую ў Расіі навучальную сельскагаспадарчую ўстанову, размешчаную ў Беларусі.

2. Назавіце найбольш значную езуіцкую калегію на тэрыторыі Беларусі.

3. Якая ўстанова з'яўлялася вядучай у Віленскай навучальнай акрузе?

4. У 1 пал. 19 ст. узнікла такая новая для Беларусі навука як …

5. У гэтым горадзе быў створаны першы ў Беларусі музей старажытнасцяў.

6. Віленскі ўніверсітэт быў закрыты ў сувязі з …

б) пытанні для вусных разгорнутых адказаў:

1. Двое вучняў будуюць на дошцы схему "Сістэма адукацыі ў 1 пал. 19 ст." і рыхтуюцца да яе тлумачэння і паказу ролі існаваўшых у 1 палове 19 ст. ВНУ на тэрыторыі Беларсуі.

2. У час іх падрыхтоўкі да адказу ў класе вядзецца высвятленне перашкод, існаваўшых для развіцця адукацыі і навукі ў Беларусі.

3. Пасля разгляду сістэмы адукацыі і высвятлення станоўчых і адмоўных бакоў яе развіцця, вучні аналізуюць развіцце навуковых ведаў.

- Якія навукі і чаму развіваліся пераважна ў 1 пал. 19 ст.?

- Назавіце самыя важныя, на ваш погляд, дасягненні ў навуковых галінах і іх значэнне для культуры Беларусі.

в) У выніку праверкі хатняга задання класам фармулюецца вывад аб узроўні развіцця адукацыі і навукі на беларускіх землях у першай палове 19 ст.

Пасля праверкі ведаў вучняў арганізуецца вывучэнне новага матэрыялу.

❖ Спачатку разглядаецца працэс стварэння новай беларускай мовы.

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на стан беларускай мовы ў першай палове 19 ст. у выніку паланізацыі і разгарнуўшайся русіфікацыі, падкрэслівае, што ў аснову літаратуры ў гэты час была пакладзена гутарковая мова насельніцтва, якая карэнным чынам адрознівалася ад мовы старабеларускіх пісьмовых помнікаў 16–17 ст., таму яна атрымала назву "новай". Далей настаўнік тлумачыць, што з-за прыналежнасці да розных рэлігійных канфесій першыя беларускія паэты і пісьменнікі пісалі зручным ім шрыфтам – або кірыліцай, або лацінкай.

❖ Затым даецца кароткая характарыстыка першых твораў новай беларускай літаратуры.



Вучні запісваюць у сшытку назвы паэм "Энеіда навыварат" і "Тарас на Парнасе" і даты іх першай публікацыі – адпаведна 1845 і 1889 гады. Настаўнік коратка знаеміць вучняў са зместам паэм, дэманструючы іх выданні вучням, і задае праблемнае пытанне: "Чаму гэтыя паэмы выдаваліся ананімна?"

Разважаючы, вучні прыходзяць да высновы, што, па-першае, беларуская мова не прызнавалася ўрадам, па-другое, у паэмах у сатырычнай форме паказваюцца прадстаўнікі феадальнага класу.

❖ Пасля гэтага пачынаецца знаемства з жыццём і творчасцю выдатных дзеячоў літаратуры Беларусі.

Калі на папярэднім уроку вучні атрымалі апераджальнае хатняе заданне падрыхтаваць паведамленні аб жыцці і дзейнасці польскіх і беларускіх паэтаў і пісьменнікаў першай паловы 19 ст., то ў гэтай частцы ўрока мэтазгодна заслухаць адно–два з іх.

Калі настаўнік вырашыў не выкарыстоўваць гэты прыём, то можна арганізаваць самастойную работу вучняў з матэрыяламі §8 падручніка па пабудове табліцы (таб.6):

Табліца 6

**Выдатныя дзеячы літаратуры Беларусі.**

| Імя дзеяча літаратуры | Асноўныя творы, іх ідэйны змест |
|---|---|
| А. Міцкевіч | |
| Я. Баршчэўскі | |
| В. Дунін-Марцінкевіч | |
| У. Сыракомля | |
| П. Багрым | |

Падчас работы па запаўненню табліцы настаўнік паведамляе, што кнігу Я.Баршчэўскага "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" параўноўвалі са зборнікам арабскіх казак "Тысяча і адна ноч"; што В. Дунін-Марцінкевіч з'яўляецца першым класікам новай беларускай літаратуры і драматургам; што П. Багрым быў не толькі таленавітым паэтам, але і кавалём, – вярнуўшыся з вайсковай службы, ён выкаваў прыгожую жырандоль для Крошынскага касцёла.

У канцы ўрока вучні разам з настаўнікам фармулююць вывад аб здабытках беларускай літаратуры першай паловы 19 ст.

У якасці хатняга задання V узроўню можна, акрамя параграфа 8, прапанаваць вучням падрыхтаваць на памяць любімы верш з творчасці паэтаў першай паловы 19 ст.

### Тэма "Друк. Бібліятэкі. Мастацтва." (§9)

На ўроку адбываецца працяг знаёмства вучняў са здабыткамі і цяжкасцямі ў развіцці беларускай культуры ў першай палове 19 ст. праз аналіз развіцця мастацтва на беларускіх землях і яго асноўных жанраў. Формы і метады работы



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на ім павінны быць накіраваны на ўдасканаленне навыкаў вучняў па аналізу і ацэнцы з'яў культуры і жанраў мастацтва, фармулёўкі вывадаў і абагульненняў.

Іх паспяховая рэалізацыя будзе спрыяць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці і годнасці вучняў, выхаванню цікавасці і павагі да дзеячоў беларускай культуры.

Таму перад урокам настаўніку неабходна ўважліва падысці да падбору сродкаў навучання і забяспечыць дастатковы ілюстратыўны матэрыял у дапаўненне да прапануемых падручнікам фотаздымкаў. Сярод іх могуць быць ілюстрацыі карцін І.Аляшкевіча, В. Ваньковіча, Я. Дамеля, І.Хруцкага, партрэт Ст. Манюшкі, фотаздымкі або малюнкі архітэктурных помнікаў у стылі класіцызму, паэма А.Міцкевіча "Свіцязянка".

Урок з'яўляецца камбінаваным, таму ў яго пачатку праводзіцца праверка хатняга задання. Для яе можна выбраць спалучэнне разнастайных прыёмаў работы для актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў усяго класа.

- Выкананне індывідуальных тэставых заданняў:

1. *Суаднясіце характарыстыкі і прозвішчы літаратараў у першай палове XIX ст.:*

а) паэт сялянскага паходжання, каваль-віртуоз, стваральнік жырандолі, аўтар верша "Зайграй, зайграй, хлопча малы";

б) польскі паэт, ёсць звесткі, што пісаў па-беларуску, аўтар паэмы "Пан Тадэвуш";

в) пісьменнік, першы беларускі паэт, аўтар шасці зборнікаў "Вясковых песень", 30 беларускіх вершаў;

г) ураджэнец Віцебшчыны, заўзяты збіральнік народных песень, казак, легендаў. Аўтар першага зборніка беларускай фантастыкі "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях", аўтар паэмы "Рабункі мужыкоў";

д) першы класік новай беларускай літаратуры, аўтар паэм "Сялянка", "Вечарніцы", "Гапон", "Купала" і інш.;

е) паэт-патрыёт Літвы і Беларусі, адстойваў правы беларусаў на сваю мову, аўтар знакамітага верша " Ямщик";

1) Я. Чачот;
2) Я.Баршчэўскі;
3) В.Дунін-Марцінкевіч;
4) У.Сыракомля;
5) П.Багрым;
6) А.Міцкевіч.



2. *Дапоўніце сказы:*

а) для пісьменнікаў першай паловы XIX ст. характэрна двухмоўная творчасць таму, што...;

б) «Энеіда навыварат» была напісана ... (указаць час напісання);

в) паэма «Тарас на Парнасе» ўпершыню была надрукавана ў 1889 г. у газеце ...;

г) па мастацкім узроўні культуры верша і мовы паэма ... стала вышэйшым дасягненнем беларускай літаратуры XIX ст.;

д) паэма «Энеіда навыварат» упершыню была апублікавана ў ...

- Пытанні для франтальнай работы з класам:
  - Якія перашкоды існавалі ў 1 пал. 19 ст. для развіцця беларускай нацыянальнай літаратуры? Чаму?
  - Чаму мова 1 пал. 19 ст. называецца «новай беларускай» і як яна ўзнікла?
  - Чаму многія творы выдаваліся ананімна, а большасць пісьменнікаў 1 пал. 19 ст. пісала па-польску?
- Арганізацыя работы па запаўненню табліцы на дошцы (таб.7):

Табліца 7

| Літаратар | Уклад у развіцце беларускай культуры |
|---|---|
| Я. Чачот<br>Я. Баршчэўскі<br>В. Дунін-Марцінкевіч<br>П. Багрым | |

- Калі будзе дастаткова часу, або па магчымасці, на занятках гуртка або факультатыва, можна арганізаваць работу па азнаямленню са зместам паэмы А.Міцкевіча «Свіцязянка» і гутарку па абмеркаванню зместу паэмы і творчасці паэта.

Па завяршэнні гэтага этапа ўрока фармулюецца вывад аб супярэчнасцях і дасягненнях беларускай літаратуры ў першай палове 19 ст.

Затым адбываецца пераход да вывучэння новага матэрыялу:

а) пункт "Друк і бібліятэкі" выносіцца на самастойнае вывучэнне.

б) характарыстыка развіцця жывапісу:

- арганізацыя самастойнай работы вучняў па вывучэнню новага матэрыяла. На падставе п.2 § 9 падручніка ў сшытку запоўніць табліцу і самастойна сфармуляваць вывад па ёй (таб. 8):

Табліца 8

| Мастак | Жанр жывапісу | Асноўныя работы |
|---|---|---|
| І.Аляшкевіч<br>В. Ваньковіч<br>Я. Дамель<br>І.Хруцкі | | |



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ